УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

811.161.3’373.2:821.161.3

**Слівец**
**Вольга Рыгораўна**

# АНАМАСТЫЧНАЯ ПРАСТОРА БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКА-БІЯГРАФІЧНАЙ ПРОЗЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці
10.02.01 – беларуская мова

МГПУ им. И. П. Шамякина

Мінск, 2021

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»

Навуковы кіраўнік: **Шур Васіль Васільевіч**,
доктар філалагічных навук, прафесар

Афіцыйныя апаненты: **Прыгодзіч Мікалай Рыгоравіч** – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, кафедра беларускага мовазнаўства

**Бут-Гусаім Святлана Феадосьеўна** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры, УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», кафедра беларускай філалогіі

Апаніруючая арганізацыя: УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

Абарона адбудзецца 3 чэрвеня 2021 года ў 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482; e-mail: lingby@gmail.com; тэлефон вучонага сакратара: +375(17)200-82-53.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Аўтарэферат разасланы «30» красавіка 2021 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый ____________ / Д.В. Дзятко

МГПУ им. И. П. Шамякина

# УВОДЗІНЫ

З пачатку XXI стагоддзя сярод мноства шматаспектных лінгвістычных даследаванняў анамастычнай лексікі асаблівую запатрабаванасць набывае вывучэнне спецыфікі функцыянавання ўласных імёнаў (паэтонімаў) у сферы літаратуры. Паэтонім у беларускім моваўнаўстве разглядаецца як неад'емны кампанент тэксту, якому ўласцівы разнастайныя лексіка-стылістычныя асаблівасці (працы Г. Басавай, Г. Дзеравяга, І. Лепешава, І. Петрачковай, А. Рогалева, В. Шура), як спецыфічная адзінка індывідуальна-аўтарскай моватворчасці, адзнака стылю пісьменніка (В. Ляшчынская, Ж. Сіпліненя, Н. Чабатар, В. Шур). Асаблівая ўвага ў апошні час надаецца вывучэнню здольнасці ўласнага імя выступаць у якасці культурнага знака, сімвала, прэцэдэнтнага імя з выразным нацыянальна-рэгіянальным кампанентам (С. Бут-Гусаім, А. Васілеўская, Ю. Гурская, Г. Кручкова, Н. Лобань, Г. Юдзянкова), прырода якога ў навуковай літаратуры яшчэ цалкам не асэнсавана. Ці не ўсімі лінгвістамі адзначаецца абумоўленасць выбару і ўжывання пэўных уласных імёнаў жанрава-тэматычнымі асаблівасцямі твораў. Даследаванню гэтай праблемы ў айчыннай літаратурнай анамастыцы прысвечаны навуковыя працы С. Бут-Гусаім, І. Петрачковай, В. Рагаўцова, Л. Хрышчановіч і іншых аўтараў, у якіх разглядаецца жанраўтваральная роля ўласных імёнаў у гістарычнай, аўтабіяграфічнай, навукова-папулярнай прозе, навукова-фантастычных творах, сатырычных тэкстах, драматургіі, беларускіх народных казках.

**Актуальнасць тэмы даследавання** абумоўлена:

- запатрабаванасцю ў сучасным моваўнаўстве вывучэння асаблівасцей функцыянавання ўласных імёнаў у сферы мастацкай літаратуры, іх здольнасці выступаць у якасці культурных знакаў, сімвалаў, прэцэдэнтных імёнаў з выразным нацыянальна-рэгіянальным кампанентам;

- неабходнасцю даследавання вызначальных уласцівасцей анамастычнай прасторы твораў, аб'яднаных на аснове жанрава-тэматычнай спецыфікі;

- адсутнасцю грунтоўных навуковых прац, прысвечаных вывучэнню мастацка-біяграфічнай прозы ў галіне філалагічнага даследавання і неакрэсленасцю агульнай канцэпцыі функцыянавання анамастычнай лексікі ў творах гэтага літаратурнага напрамку.

МГПУ им. И.П. Шамякина

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры беларускай і рускай філалогіі УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна» ў межах навуковых тэм «Сістэма духоўна-маральных каардынат быцця творчай асобы 30−50-х гг. XX ст. у сучаснай мастацка-біяграфічнай і дакументальна-эсэістычнай літаратуры» па заданню 4.2.29 «Руская і беларуская літаратуры XX–XXI ст.: праблема асобы і грамадства» ДПНД «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» (№ ДР 20112527, 2011–2015 гг.); «Уласныя імёны ў соцыуме, творах мастацкай літаратуры, фальклоры: іх мастацка-эстэтычныя, жанраўтваральныя і тэкстаўтваральныя функцыі ў розныя перыяды» (№ ДР 20160336), якая ўключана ў заданне 4.1.06 «Беларускія ўласныя імёны ў соцыуме, творах мастацкай літаратуры і фальклоры» падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гады; у межах кафедральнай тэмы (2016–2020) «Слово, образ, текст в современной парадигме знаний: лингвистический и дидактический аспекты», зацверджанай Саветам універсітэта 23.12.2016 (пратакол № 5) і загадам рэктара № 1328 ад 23.12.2016.

Па выніках дысертацыйнага даследавання і выканання гадавога этапу НДР «Уласныя імёны ў соцыуме, творах мастацкай літаратуры, фальклоры: іх мастацка-эстэтычныя, жанраўтваральныя і тэкстаўтваральныя функцыі ў розныя перыяды» ў суаўтарстве з В. Шурам выдадзена манаграфія «Малая і вялікая радзіма ў анамастыконе пісьменнікаў», матэрыялы якой адпавядаюць п. 111. (ажыццяўленне выпуску выданняў, прысвечаных «Году малой радзімы») плана Рэспубліканскай праграмы мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь 2018–2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы (зацв. Пастановай Савета Міністраў РБ ад 18.07.2018 № 547).

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта* дысертацыйнага даследавання – вылучэнне лексіка-семантычных і функцыянальна-стылістычных асаблівасцей анамастычнай лексікі беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя, выяўленне яе нацыянальнай і гісторыка-культурнай спецыфікі.

Пастаўленая мэта прадугледжвала вырашэнне наступных *задач*:

- акрэсліць жанрава-тэматычныя і функцыянальна-семантычныя ўласцівасці анамастыкону мастацка-біяграфічнай прозы як асобнага літаратурнага напрамку;

МГПУ им. И.П. Шамякина

- вылучыць ключавыя кампаненты анамастычнай прасторы мастацка-біяграфічных твораў беларускіх пісьменнікаў;

- вызначыць агульныя семантыка-стылістычныя асаблівасці антрапанімікону мастацка-біяграфічных твораў і спосабы функцыянавання ў іх прэцэдэнтных імёнаў;

- ахарактарызаваць ролю тапонімаў у фарміраванні хранатопу і канатацыйны бок ужывання геаграфічных намінацый у кантэксце ідэйна-тэматычнага зместу твораў мастацка-біяграфічнай прозы;

- выявіць нацыянальна і гісторыка-культурныя адметнасці анамастычнай лексікі беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя.

Асноўнымі крыніцамі фактычнага матэрыялу паслужылі тэксты мастацка-біяграфічнай прозы В. Карамазава («Крыж на зямлі і поўня ў небе» (1991), «Мой брат духоўны…» (2001), «Антон» (2005), «Брама» (2006), «Мастак і парабкі» (2011), «Зямля Фердынанда» (2016) і інш.) і А. Лойкі («Як агонь, як вада…» (1984, 2000), «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (2009), «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (2010)), якія дэманструюць шырокі жанрава-тэматычны дыяпазон твораў акрэсленай літаратурнай плыні, а таксама семантычную і функцыянальную разнастайнасць іх анамастыкону. Дадатковымі крыніцамі сталі мастацкія тэксты іншых беларускіх аўтараў (Р. Барадуліна, В. Коўтун, А. Мальдзіса, А. Марціновіча, М. Стральцова і інш.), створаныя ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя ў рэчышчы мастацка-біяграфічнага напрамку. Фактычны матэрыял анамастычных адзінак, адабраных з твораў гэтых пісьменнікаў, выкарыстоўваецца спарадычна, пераважна для дадатковай ілюстрацыі і абгрунтавання некаторых аспектаў даследавання.

**Аб’ект** даследавання – анамастыкон сучаснай беларускай мастацка-біяграфічнай прозы.

**Прадмет** даследавання – лексіка-семантычны склад, функцыянальныя і жанраўтваральныя ўласцівасці анамастыкону беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя.

Пры напісанні дысертацыі былі выкарыстаны агульнанавуковыя метады абагульнення, аналізу, сістэматызацыі, а таксама апісальна-інтэрпрэтацыйны, параўнальна-супастаўляльны, стылістычны метады вывучэння анамастычных адзінак, сабраных шляхам суцэльнай і мэтавай выбарак з мастацкіх тэкстаў В. Карамазава, В. Коўтун, А. Лойкі, А. Мальдзіса, А. Марціновіча, М. Стральцова і інш. аўтараў, іх кантэкстуальны аналіз, прыёмы колькаснага падліку, лінгвакультуралагічнае і лінгвакраязнаўчае каменціраванне.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Навуковая навізна:** упершыню комплексна даследаваны анамастыкон беларускай мастацка-біяграфічнай прозы, абгрунтавана жанрава-стылёвая і ідэйна-тэматычная абумоўленасць яе анамастычнай прасторы. На новым моўным матэрыяле, адабраным з мастацка-біяграфічных твораў В. Карамазава, В. Коўтун, А. Лойкі, А. Мальдзіса, А. Марціновіча, М. Стральцова і іншых аўтараў, прааналізаваны семантычныя, функцыянальныя і стылістычныя асаблівасці паэтонімаў у кантэксце гісторыі і культуры, іх сістэмна-вобразных адносін, выяўлены спосабы функцыянавання прэцэдэнтных феноменаў, нацыянальная дэтэрмінаванасць іх ужывання ў складзе другасных намінацый.

Новым навуковым прадуктам з'яўляецца распрацаваны слоўнік анамастычнай лексікі мастацка-біяграфічных твораў В. Карамазава, складзены ў выніку апрацоўкі картатэкі ўласных імёнаў, зафіксаваных у такіх аповесцях аўтара, як «Крыж на зямлі і поўня ў небе» (1991), «Антон» (2005), «Брама» (2006), «Зямля Фердынанда» (2016), які ўключае больш за 1400 слоўнікавых артыкулаў (ДАДАТАК А). Падрыхтаваны матэрыялы да слоўніка анамастычных перыфраз (69 адзінак), якія пакуль не атрымалі сістэмнага апісання ў айчынным мовазнаўстве (ДАДАТАК Б).

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Для мастацка-біяграфічнай прозы як асобнага літаратурнага напрамку ўласціва гарманічнае спалучэнне дакументалізму, фактаграфічнасці, прыналежнасці рэферэнтаў да рэальнага свету і разам з тым аўтарскага вымыслу, суб'ектывізму, што ў многім вызначыла выбар і асаблівасці анамастыкону гэтых твораў, які варта разглядаць у якасці важнейшага элемента ў структуры мастацкіх тэкстаў, сродку стварэння сацыяльна-гістарычнага, нацыянальна-культурнага, рэгіянальна-этнаграфічнага каларыту для разгортвання ідэйна-мастацкага зместу, сюжэтных ліній, характарыстыкі вобразаў-персанажаў, арганізацыі часава-прасторавых параметраў твора.

Анамастыкон твораў абазначанага літаратурнага напрамку грунтуецца на падставе агульнанароднай анамастыкі і непасрэдным чынам залежыць ад сацыяльнага і культурнага кантэксту пэўнай гістарычнай эпохі, адлюстраванай у канкрэтным творы. Жанрава-тэматычная адметнасць мастацка-біяграфічнай прозы вызначыла зварот аўтараў да рэальных прататыпаў, чый сацыяльна-культурны статус абумовіў прэцэдэнтнасць іх імёнаў і, як вынік, характар інтэртэкстуальных уключэнняў у мастацкі твор, якія пераважна апелююць да сфер мастацтва, літаратуры, гісторыі.

2. Анамастычная прастора мастацка-біяграфічнай прозы максімальна набліжана да дакладнай перадачы сацыяльна-гістарычнага і этнамоўнага асяроддзя, якое ўзнаўляецца ў мастацкім тэксце, і ўяўляе сабою адпаведны

МГПУ им. И. П. Шамякина

анамастычны зрэз адлюстраванай эпохі. Для яе характэрны ярка выражаны антрапацэнтрызм, абумоўлены агульнай ідэйна-мастацкай канцэпцыяй твораў, якая прадугледжвае філасофскае асэнсаванне лёсу знакавай для айчыннай гісторыі і культуры асобы, што ў сваю чаргу вызначае колькасны і семантычны склад агульнага антрапанімікону, у якім пераважаюць прэцэдэнтныя імёны, ужытыя з дэнататыўным значэннем. Да ядра анамастычнай прасторы прааналізаваных твораў набліжаны рэальныя тапонімы, якія выступаюць у якасці адзнак рэгіянальнасці і біяграфічнасці.

Семантычная ўскладненасць і багаты канатацыйны патэнцыял загалоўкаў мастацка-біяграфічных твораў дазваляюць кваліфікаваць іх у якасці ключавых кампанентаў тэксту і ўсёй анамастычнай прасторы, што дасягаецца дзякуючы іх поліфункцыянальнасці і здольнасці адначасова выступаць адзінкамі лексічнага і сінтаксічнага ўзроўняў, а ў семіятычным плане як асобы знак тэксту.

3. Жанрава-тэматычная спецыфіка мастацка-біяграфічнай прозы, у прыватнасці, прынцып фактаграфічнасці, пакладзены ў яе аснову, абмяжоўвае і не дае аўтарам абсалютнай свабоды ў падборы антрапонімаў. Падкрэсленая адпаведнасць антрапанімікону заканамернасцям рэальнага іменніка ўзмацняецца за кошт ужывання аўтарамі нацыянальна адметных варыянтаў асабовых імёнаў, якія адлюстроўваюць фанетыка-марфалагічныя асаблівасці моўнага асяроддзя рэгіёна. Зафіксаваныя тыпы антрапонімаў, формулы іменавання служаць для рэпрэзентацыі персанажаў твораў, а таксама выкарыстоўваюцца ў якасці іх дадатковых ацэначна-характарыстычных сродкаў.

Асацыятыўна-семантычны патэнцыял прэцэдэнтных антрапонімаў і здольнасць да актуалізацыі экстралінгвістычнай, пазатэкставай інфармацыі даюць магчымасць выкарыстоўваць такія адзінкі ў складзе анамастычных метафар, параўнанняў, перыфраз, якія выступаюць маркёрамі інтэртэкстуальных сувязей, узбагачаюць гісторыка-культурны кантэкст твораў і паглыбляюць іх ідэйна-мастацкі змест.

4. Тапанімічная прастора прааналізаваных твораў характарызуецца выразнай біяграфічнасцю і рэгіяналізмам. Тапанімікон мастацка-біяграфічнай прозы фарміруюць пераважна рэальныя геаграфічныя назвы, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі хранатопу і служаць сродкам мастацкай выразнасці, што дасягаецца дзякуючы ўзнаўленню іх канатацыйнага патэнцыялу, стылістычных магчымасцей і актуалізацыі ўнутранай формы. Асаблівае значэнне набываюць назвы топааб’ектаў, суадносных з геаграфічнай прасторай Беларусі, што абумоўлена мастацкай інтэрпрэтацыяй тэмы малой

МГПУ им. И. П. Шамякина

радзімы як скразной у прааналізаваных творах і індывідуальна-аўтарскай светапогляднай і творчай канцэпцыямі.

Актуалізацыя лакальна-тэмпаральных асацыяцый, гісторыка-сацыяльных і культуралагічных канатацый тапонімаў, асабліва прэцэдэнтных, абумовіла іх выкарыстанне ў якасці мастацка-стылістычных сродкаў пераважна для стварэння нацыянальна-рэгіянальнага каларыту і ў складзе другасных намінацый, якія апелююць да шырокага кола фонавых ведаў інтэркультурнага характару.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.** Дысертацыя з'яўляецца самастойнай навуковай працай. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі даследавання, напісаны без суаўтараў. Манаграфія падрыхтавана ў суаўтарстве з навуковым кіраўніком прафесарам В. Шурам.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на наступных навуковых канферэнцыях: Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Слова, фразеалагізм, перыфраза» (да 80-х угодкаў праф. Г. М. Малажай (Брэст, 15 сакавіка 2018 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблема вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час» (Гомель, 18 мая 2018 г.); XXVII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Язык и культура» імя С. Бурага (Кіеў, 25–27 чэрвеня 2018 г.); Міжнародных навуковых чытаннях да 100-годдзя з дня нараджэння праф. Ф. Янкоўскага (Мінск, 18–19 кастрычніка 2018 г.); IV і V Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Языковая личность и эффективная коммуникация в современном коммуникативном мире» (Мінск, 25–26 кастрычніка 2018 г., 24–25 кастрычніка 2019 г.); X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Детский сад – начальная школа: опыт, преемственность, перспективы» (Мазыр, 01–02 лістапада 2018 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Малая радзіма ў творчасці беларускіх пісьменнікаў» (Мінск, 01 сакавіка 2019 г.); III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Лингвистика, лингводидактика, лингвокультурология: актуальные вопросы и перспективы исследования» (Мінск, 14–15 сакавіка 2019 г.); X Міжнароднай канферэнцыі «Текст. Язык. Человек» (Мазыр, 17–18 мая 2019 г.); VI Міжнародных Шамякінскіх чытаннях «Пісьменнік – Асоба – Час» (Мазыр, 27 верасня 2019 г.); Першым Міжнародным навуковым кангрэсе «Беларуская мова – галоўная гісторыка-культурная каштоўнасць нацыі і дзяржавы» (да 90-годдзя Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа) (Мінск, 31 кастрычніка – 01 лістапада 2019 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы

МГПУ им. И. П. Шамякина

сучаснага літаратурнага працэса» (Брэст, 20 лістапада 2019 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі маладых даследчыкаў «Шаг в науку: проблемы, поиски, решения» ў межах культурна-асветніцкага і навуковага мерапрыемства «Славянские встречи» (Гомель, 09–10 снежня 2019 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Язык и культура региона как составляющие образовательного пространства» (Белгарад, 14–15 мая 2020 г).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі.** Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 17 публікацыях (6,8 аўт. арк.), з іх 4 навуковыя артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях (1,7 аўт. арк.), у тым ліку ў адным замежным; 7 артыкулаў у зборніках навуковых прац (2,3 аўт. арк.), 5 артыкулаў у зборніках матэрыялаў рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцый (1,4 аўт. арк.), публікацыя ў манаграфіі, выдадзенай у суаўтарстве (1,4 аўт. арк.).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (280 пазіцый) і спіс публікацый саіскальніка (17 пазіцый). Дысертацыя мае два дадаткі: А) Слоўнік анамастычнай лексікі мастацка-біяграфічных твораў Віктара Карамазава; Б) Анамастычныя перыфразы. Агульны аб'ём працы – 322 старонкі, з якіх тэкст дысертацыі непасрэдна займае 175 старонак, бібліяграфічны спіс – 27 старонак, дадаткі – 120 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

*У Главе 1* ***«Тэарэтычныя аспекты вывучэння анамастыкі мастацкіх тэкстаў»*** асвятляюцца асаблівасці даследавання ўласных імёнаў у сферы мастацкай літаратуры.

*Раздзел 1.1* ***«Беларуская літаратурная анамастыка на рубяжы XX – XXI стст.»*** мае аглядава-аналітычны характар.

Адзначаецца, што тэарэтычнай базай для станаўлення і развіцця літаратурнай анамастыкі сталі працы В. Бандалетава, В. Калінкіна, Ю. Карпенкі, У. Ніканава, Н. Падольскай, В. Супруна, А. Супяранскай, В. Фаняковай, якімі былі абгрунтаваны адметныя якасці аб'екта і прадмета даследавання агульнай анамастыкі, а таксама распрацаваны асноўныя палажэнні адносна спецыфікі функцыянавання ўласнага імя ў мастацкім маўленні.

Пачатак XXI ст. характарызуецца ўзнікненнем у айчынным мовазнаўстве комплексных даследаванняў у галіне анамастыкі, сярод якіх працы Г. Басавай,

МГПУ им. И. П. Шамякина

В. Ляшчынскай, Г. Мезенка, А. Рогалева, В. Шура і іншых лінгвістаў. Актуальнасць і запатрабаванасць набывае вывучэнне анамастыкону ў кагнітыўным, сацыялінгвістычным, лінгвакультуралагічным, лінгвапрагматычным аспектах, аб чым сведчаць даследаванні С. Бут-Гусаім, Я. Вільтоўскай, Ю. Гурскай, Г. Дзеравяга, С. Лясовіч, І. Петрачковай, С. Прохаравай, І. Ратнікавай, Т. Сарачынскай, А. Супруна, Г. Юдзянковай.

Натуральным вынікам уздыму ў другой палове XX – пачатку XXI ст. даследаванняў у галіне анамастыкі і назапашвання тэарэтычных дадзеных стала лексікаграфічная апрацоўка і апісанне ўласных імёнаў, якая патрабуе далейшага развіцця.

У *раздзеле 1.2* ***«Жанрава-стылёвая і ідэйна-тэматычная спецыфіка мастацка-біяграфічнай прозы»*** выяўлена, што прынцып дакументалізму, пакладзены ў аснову мастацка-біяграфічных твораў, і зварот аўтараў да прататыпаў, натуральна абумовілі выкарыстанне рэальнага анамастыкону, адпаведнасць антрапанімічнай прасторы традыцыйнаму іменніку пэўнага часу, выразнае адлюстраванне нацыянальна-культурнага кампанента, апору на рэальны тапанімікон у часава-прасторавай арганізацыі твораў, высокую частотнасць ужывання прэцэдэнтных адзінак у дэнататыўным і канатацыйным значэннях. Прыналежнасць твораў названага напрамку да інтэлектуальнага дыскурсу, адрасаванасць кампетэнтнаму рэцыпіенту, які мае сфарміраванае ўласнае меркаванне адносна той ці іншай з'явы, падзеі, апісанай у тэксце, непасрэдна звязана з багаццем інтэртэкстуальных уключэнняў, шырокім вертыкальным кантэкстам гэтых твораў, што таксама патрабуе падрабязнага даследавання.

*Раздел 1.3* ***«Анамастычная прастора беларускай мастацка-біяграфічнай прозы»*** прысвечаны аналізу асноўных палажэнняў адносна ключавога паняцця ў літаратурнай анамастыцы – анамастычнай прасторы мастацкага тэксту. Адпаведна былі вылучаны асаблівасці анамастычнай прасторы твораў мастацка-біяграфічнай прозы.

На прыкладзе анамастыкону аповесці-біяграфіі В. Карамазава «Брама» разгледжана семантычная разнастайнасць анамастычных палёў твора. Вызначана, што самымі ўжывальнымі паэтонімамі выступаюць антрапонімы, якія складаюць 34,9 % (133 адзінкі), тапонімы – 27,5 % (105 адзінак), астатнія 36,9 % фарміруюць міфонімы, заонімы, біблеізмы, эргонімы, бібліёнімы, артыёнімы, хрононімы. Даволі аб'ёмнае семантычнае аб'яднанне ўтвараюць артыёнімы – 56 анамастычных адзінак (14,7 %), што абумоўлена жанрава-тэматычнай спецыфікай твора, які ўяўляе сабою белетрызаваную біяграфію беларускага жывапісца Г. Вашчанкі.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Акцэнтуецца ўвага на шчыльнасці і багацці ўжывання ўласных імёнаў у творах мастацка-біяграфічнай прозы, што дасягаецца разнастайнасцю прыёмаў выкарыстання і спосабаў увядзення анамастычнай лексікі, шырынёю асацыятыўнага фону прааналізаваных тэкстаў. Так, у рамане-эсэ пра Янку Купалу «Як агонь, як вада…» А. Лойкам біяграфія народнага паэта асэнсоўваецца праз непарыўную еднасць з гісторыяй беларускай зямлі канца XIX – пачатку XX ст. Аўтар прэзентуе партрэт цэлай эпохі, яе грамадска-палітычнага ладу, таму персанажамі твора сталі рэальныя асобы – выдатныя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, грамадскія і культурныя дзеячы таго часу, імёны якіх з'яўляюцца прэцэдэнтнымі і пераважна размешчаны ў каляядзернай прасторы тэксту. У колькасных адносінах антрапанімікон рамана надзвычай багаты, што абумоўлена як жанрам твора, так і творчай задачай пісьменніка – усебакова паказаць біяграфію Янкі Купалы (асабістую, творчую, грамадскую) у кантэксце жыцця цэлага народа, гістарычнай эпохі.

У *раздзеле 1.4* ***«Загаловак як цэнтральны кампанент анамастычнай прасторы мастацкага тэксту»*** аналізуюцца спецыфічны статус і роля гэтага ўласнага імя ў арганізацыі анамастычнай прасторы і ідэйна-мастацкай канцэпцыі твора ўвогуле. Вылучаюцца адметныя рысы бібліёнімаў з улікам жанрава-тэматычнай спецыфікі літаратурных твораў. Прыводзяцца класіфікацыі загалоўкаў паводле сінтаксічных мадэляў і з улікам іх спосабаў актуалізацыі і семантыкі ў мастацкім тэксце.

На прыкладах бібліёнімаў з беларускай мастацка-біяграфічнай прозы паказана іх поліфункцыянальнасць і здольнасць выступаць у якасці актуалізатараў асноўных тэкставых катэгорый. Асаблівая ўвага надаецца выяўленню інтэртэкстуальных сувязей, здольнасці загалоўка ўключаць мастацкі тэкст у міжкультурны дыялог.

У *Главе 2* ***«Антрапанімікон беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI ст.»*** вылучаюцца тры раздзелы.

У *раздзеле 2.1* ***«Семантыка-стылістычная арганізацыя антрапанімікону беларускай мастацка-біяграфічнай прозы»*** засяроджваецца ўвага на вылучэнні нацыянальна-культурнага кампанента антрапонімаў. Паказальныя ў гэтых адносінах творы В. Карамазава, які працуе ў жанры белетрызаваных біяграфій прадстаўнікоў жывапісу.

Паняцце *нацыянальнага* ў ідэйна-мастацкім змесце твораў пісьменніка займае цэнтральную пазіцыю і раскрываецца ў розных аспектах яго інтэрпрэтацыі і разумення. Адметныя рысы і заканамернасці мае антрапанімічная сістэма гэтых твораў, дзе вялікая ўвага надаецца праўдзіваму ўзнаўленню рэчаіснасці, асяроддзя, з якім былі звязана жыццё і творчая

МГПУ им. И. П. Шамякина

дзейнасць мастакоў. Быў прааналізаваны антрапанімікон аповесцей *«Крыж на зямлі і поўня ў небе»* (1991), *«Антон»* (2005), *«Брама»* (2006) і *«Зямля Фердынанда»* (2016), у якіх дзеянне адбываецца ў розныя часавыя адрэзкі, што вызначыла спецыфіку антрапанімічнай сістэмы гэтых мастацкіх тэкстаў. Сярод іншых разрадаў онімаў у прааналізаваных творах антрапонімы самыя ўжывальныя, што адлюстравана ў табліцы 1:

Табліца 1. – Колькасны склад антрапонімаў у мастацка-біяграфічных творах В. Карамазава

| Назва твора | Колькасць антрапонімаў у творы | Працэнтныя суадносіны антрапонімаў з агульнай колькасцю паэтонімаў |
|---|---|---|
| «Крыж на зямлі і поўня ў небе» | 356 | 50,9 % |
| «Антон» | 107 | 50,7 % |
| «Брама» | 133 | 34,9 % |
| «Зямля Фердынанда» | 127 | 45,3 % |

У адпаведнасці з пэўнымі мастацка-стылістычнымі задачамі В. Карамазавым выкарыстаны самыя розныя формы іменавання персанажаў, сярод якіх пераважаюць аднакампанентныя мадэлі «асабовае імя» і «прозвішча». Такія онімы суадносяцца з беларускім іменасловам адпаведнага перыяду і выяўляюць нацыянальна адметныя асаблівасці (пераважна неафіцыйныя варыянты імёнаў тыпу *Алесь, Антось, Васіль, Міхась*). Усе прозвішчы ў прааналізаваных творах называюць рэальных асоб, якія маюць прататыпаў – дзеячаў гісторыі, культуры XIX – XXI стст. Многія з імёнаў гэтых персанажаў вядомыя ў нашай лінгвакультурнай супольнасці і набылі шэраг дадатковых асацыяцый і канатацый, аднак у мастацка-біяграфічных творах яны пераважна ўжываюцца з несімвалічным значэннем. Іх асноўнае прызначэнне – ідэнтыфікацыя персанажаў і ўвасабленне хранатопу твораў.

*У раздзеле 2.2* ***«Мянушкі ў сістэме літаратурных антрапонімаў»*** разгледжаны неафіцыйныя празванні чалавека. Амаль усе індывідуальныя мянушкі ў прааналізаваных творах канатацыйна насычаныя і маюць выразную нацыянальную і культурна-гістарычную спецыфіку, што выяўляецца праз ацэнку дзейнасці, учынкаў персанажа, яго маральнага аблічча, жыццёвых прынцыпаў (*Абыціха, Баечнік, Вол, Свіное Вока, Таўкач, Трапачка*). Дэрывацыйнай базай для некаторых мянушак становяцца прэцэдэнтныя імёны, якія ствараюцца асацыятыўным спосабам (*Леў Талстой, Рэмбрант, Чапай*). Не меншымі гісторыка-культурнымі канатацыямі валодаюць і выяўленыя групавыя мянушкі (*вашчылы, гіргуны, петрашэўцы, шапцюхі, Кірыла і*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*Мяфодзій*). Асобую групу ўяўляюць унутрысямейныя (генесіянімічныя) мянушкі-празванні, прадыктаваныя нацыянальнымі традыцыямі рэальнага антрапанімікону, што надае такім адзінкам лінгвакультуралагічны патэнцыял (*Луцэўчык*, *Купаліха*, *Пашкевічанка*, пані *Кайрысова* і інш.). Да ліку мянушак адносім і адантрапанімічныя дэрываты (*Бірулька* ← В. Бялыніцкі-Біруля, *Жукавіні* ← С. Жукоўскі, *Гром-Грамыка* ← М. Грамыка), якія звычайна набываюць розныя адценні дзякуючы экспрэсіўна-эмацыянальным фармантам і дадатковым асацыяцыям, якія ўзнікаюць адносна носьбіта імя ці звязаны з гучаннем і значэннем эпоніма.

*Раздзел 2.3* ***«Прэцэдэнтныя антрапонімы ў мове беларускай мастацка-біяграфічнай прозы»*** прысвечаны аналізу спецыфікі функцыянавання прэцэдэнтных феноменаў у мастацкім тэксце і іх канатацыйных магчымасцей.

У *падраздзеле 2.3.1* ***«Інтэртэкстуальныя элементы і спосабы апеляцыі да прэцэдэнтных феноменаў»*** даецца абгрунтаванне вылучэння інтэртэкстуальнасці ў якасці цэнтральнай тэкставай катэгорыі ў творах названага літаратурнага напрамку.

На моўным матэрыяле твораў мастацка-біяграфічнай прозы беларускіх аўтараў разгледжаны розныя тыпы прэцэдэнтных адзінак як маркёраў інтэртэкстуальных сувязей і спосабы апеляцыі да іх. З улікам лакалізацыі функцыянавання прэцэдэнтных онімаў у соцыуме і іх суаднесенасці з узроўнямі свядомасці моўнай асобы сістэматызаваны прэцэдэнтныя імёны (антрапонімы) у мове аповесці В. Карамазава «Брама». Вызначана, што найбольшую значнасць у стварэнні культурна-гістарычнага кантэксту твора маюць менавіта нацыянальна-прэцэдэнтныя феномены. У ліку такіх імёнаў, звязаных з айчыннай культурай, пераважаюць антрапонімы са сфер-крыніц «Літаратура» і «Гісторыя».

У *падраздзеле 2.3.2* ***«Спосабы функцыянавання прэцэдэнтных антрапонімаў»*** разглядаюцца ўмовы развіцця ў прэцэдэнтных імёнаў канатацыйных значэнняў і адметнасці іх ужывання ў складзе анамастычных перыфраз, метафар, параўнанняў.

У мастацка-біяграфічных творах беларускіх аўтараў былі выяўлены і сістэматызаваны анамастычныя перыфразы, у склад якіх уваходзяць прэцэдэнтныя антрапонімы або якія скіроўваюць да прэцэдэнтных імёнаў. Паказальна, што сярод прааналізаваных перыфраз пераважаюць этнамаркіраваныя апісальныя выразы, зразумелыя для большасці прадстаўнікоў беларускай лінгвакультурнай супольнасці: *аўтар неўміручага «Вянка»* – ‘Максім Багдановіч’; *златавуст найпершы сярод славянаў* – ‘Кірыла Тураўскі’; *часы Вітаўта* –‘перыяд росквіту Вялікага Княства Літоўскага’.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Выкарыстанне ўласных імёнаў з пераносным значэннем пераважна грунтуецца на мадэлі метафары. Як правіла, метафарычнаму ўжыванню ў тэкстах сучаснай беларускай мастацка-біяграфічнай прозы падвяргаюцца ўніверсальна- і нацыянальна-прэцэдэнтныя імёны: *Перад вамі – другі Хадыка* (А. Мальдзіс); *Бо не будзе ў яго іншага маўзалея, як гэтая турма. Не Тамерлан жа ён! Не Медзічы! Не Уладзіслаў Ягела!* (А. Лойка).

Выразную нацыянальную спецыфіку маюць анамастычныя параўнанні, у пазіцыі аб'ектаў якіх выступаюць прэцэдэнтныя імёны, што апелююць да беларускай гісторыі, культуры, міфалогіі, прэцэдэнтных у сферы айчыннай літаратуры тэкстаў: *«Жыціе…» сапраўды хвалявала бязмерна, бо ён жа, Францішак Скарына, не князеў сын, як Прадслава – дачка князева* (А. Лойка); *Гляне вачмі віластымі, агнянымі – ну, бог паганскі, Дажбог ці Жыжаль**,** падобны на дэмана* (В. Карамазаў).

*Глава 3.* ***«Тапанімікон беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI ст.»*** прысвечана даследаванню сістэмнай арганізацыі і функцыянавання геаграфічных намінацый у сферы мастацкага тэксту. Глава складаецца з чатырох раздзелаў.

У *раздзеле 3.1.* ***«Рэальныя геаграфічныя намінацыі»*** разглядаюцца асаблівасці семантыкі і роля рэальных тапанімічных адзінак у фарміраванні прасторава-часавых каардынат твораў мастацка-біяграфічнага напрамку. Вызначаецца абумоўленасць іх тапанімікону фактамі біяграфій прататыпаў галоўных герояў.

Тапанімікон мастацка-біяграфічнай прозы характарызуецца багатым колькасным складам геаграфічных намінацый і тэрытарыяльным ахопам прасторы. Назвы буйных геаграфічных аб'ектаў (макратапонімы, айконімы, гідронімы), іх ужывальнасць аналізуюцца ў *падраздзеле 3.1.1* ***«Назвы буйных геаграфічных аб'ектаў»***. Такія тапонімы фарміруюць мадэль рэальнай геаграфічнай прасторы і ўказваюць на асноўнае месца дзеяння ў літаратурным творы ці ў асобных яго эпізодах. Найбольш ужывальныя тапонімы, як правіла, выконваюць біяграфічную функцыю, указваючы на месца нараджэння ці пражывання галоўных герояў і выступаючы маркёрамі вызначальных этапаў іх жыцця. Так, з лёсам В. Бялыніцкага-Бірулі звязаны такія тапонімы, як *Быстрэя, Бялынічы, Краснаполле, Магілёўшчына, Дзвіна, Друць,* бо гэта назвы яго малой радзімы, дзяцінства; *Астраўно, Вараніха, Гарусава, Масква, Удомля*, з якімі паяднана амаль уся яго далейшая біяграфія.

Дэталёваму паказу, дакладнай прасторава-часавай лакалізацыі дзеяння, «падмацаванню» яго сапраўднасці і паглыбленню гісторыка-культурнага фону

МГПУ им. И.П. Шамякина

садзейнічае ўвядзенне ў агульны тапанімікон твораў дробных геаграфічных найменняў, якія разгледжаны ў *падраздзеле 3.1.2.* ***«Мікратапонімы»***.

Асновай мадэлі рэальнай геаграфічнай прасторы мастацка-біяграфічных твораў сталі айконімы, астыёнімы ў прыватнасці, таму асобае стылістычнае значэнне набывае стварэнне гарадской прасторы, якая адлюстроўвае ўнікальна-аўтарскае і ўніверсальна-нацыянальнае яе ўспрыняцце. Гэта прастора пераважна мадэлюецца за кошт вербалізацыі значных унутрыгарадскіх аб’ектаў, якія прааналізаваны ў *падраздзеле 3.1.3* ***«Урбанонімы»***. Рэальныя ўрбанонімы ўжываюцца з мэтаю фарміравання тапаграфічнай адпаведнасці адлюстраванай у мастацкім тэксце прасторы з рэчаіснасцю. Большасць тапанімічных адзінак суадносіцца з урбананіміяй гарадоў *Масква* (30,2 %), *Мінск* (14,1 %), *Пецярбург* (11,3 %) і *Кіеў* (9,4 %).

У *раздзеле 3.2* ***«Малая радзіма ў тапанімічнай прасторы беларускай мастацка-біяграфічнай прозы»*** акцэнтуецца ўвага на асаблівым ідэйна-мастацкім значэнні ў творах абазначанага літаратурнага напрамку рэпрэзентацыі *малой радзімы*. Паказальнай у гэтым плане бачыцца творчасць В. Карамазава. Прааналізаваны моўны матэрыял дазволіў выявіць дамінантнае палажэнне анамастыкону *Магілёўшчыны* і *Палесся* ў агульнай тапанімічнай прасторы яго твораў, што абумоўлена біяграфіямі як літаратурных герояў, так і самога аўтара.

Тапанімікон мастацка-біяграфічнай прозы беларускіх пісьменнікаў характарызуецца выразнай нацыянальна-рэгіянальнай адметнасцю, што разгледжана ў *раздзеле 3.3* ***«Мастацка-стылістычныя прыёмы адлюстравання нацыянальна-рэгіянальнага каларыту тапонімаў»***.

У *падраздзеле 3.3.1* ***«Нацыянальна адметныя тапанімічныя мадэлі»*** падкрэсліваецца свядомае ўжыванне пісьменнікамі геаграфічных назваў з рэгіянальна адметнымі фармантамі, суфіксам *-шчын-* у прыватнасці. Выкарыстанне тапонімаў на *-шчына* ў якасці неафіцыйных найменняў раёнаў, абласцей, краін (пры наяўнасці перад аўтарамі альтэрнатывы ўжывання афіцыйных назваў, напрыклад, *Магілёўская вобласць* замест *Магілёўшчына*) варта расцэньваць як асобы мастацка-стылістычны прыём, якім аўтары свядома падкрэсліваюць нацыянальна-этнаграфічны каларыт рэгіёна.

Гісторыка-культурныя канатацыі тапонімаў ўзмацняюцца за кошт узнаўлення іх унутранай формы, выкарыстання пісьменнікамі прыёмаў і сродкаў мастацкай этымалагізацыі, якія сістэматызуюцца ў *падраздзеле 3.3.2* ***«Прыёмы мастацкай этымалагізацыі тапонімаў»***.

З мэтаю стварэння канкрэтнага гісторыка-культурнага кантэксту і каб пазбегнуць анахранізацыі тэксту аўтарамі выкарыстоўваюцца ўстарэлыя

МГПУ им. И. П. Шамякина

тапонімы, якія выражаюць у літаратурным творы не толькі катэгорыю прасторы, але і часу, што адзначаецца ў *падраздзеле 3.3.3* ***«Устарэлыя тапонімы як сродкі выражэння гісторыка-культурнага кантэксту мастацкіх твораў»***. У мове прааналізаваных твораў былі засведчаны лексіка-семантычныя групы *тапонімаў-гістарыёнімаў* (*Вялікае Княства Літоўскае, Жамойць, Магілёўская губерня* і інш.) і *тапонімаў-археонімаў* (*Бярэсце, Менск, Ленінград* і інш.).

У *раздзеле 3.4* ***«Тапонімы ў складзе другасных намінацый»*** геаграфічныя назвы разглядаюцца ў якасці рэферэнтаў антанамазіі, у метанімічных і метафарычных ужываннях, у складзе параўнальных канструкцый, перыфраз.

Большасць тапанімічных метафар фарміруецца на аснове метафарычнага ўжывання ўніверсальна-прэцэдэнтных тапонімаў, якія з'яўляюцца феноменамі інтэркультуры і ў розных лінгвакультурных супольнасцях маюць аднолькавыя канатацыйныя значэнні. Напрыклад, аронім *Карпаты* рэалізуецца з агульным значэннем 'горы', тапонім *Антарктыда* – 'мясцовасць, пакрытая лёдам': *У нас – усё, што трэба для душы: <…> ёсць горы, хоць і лагойскія, маленькія Карпаты, азёры – тыя ж моры, і Антарктыду вясною ўбачыш – лёд на лёдзе, крыгаход* (В. Карамазаў).

У параўнанні з тапанімічнай метафарай, найбольш шырока ў прааналізаваных мастацкіх тэкстах прадстаўлена тапанімічная метанімія. Пераважная частка метанімічных ужыванняў тапонімаў будуецца на прасторавай сумежнасці і рэалізуецца паводле мадэлі «тапонім – насельніцтва»: *…Тубушкі адпявалі Чарняева ў царкве…* (В. Карамазаў). Значныя для гісторыі, жыцця і развіцця краіны, рэгіёна падзеі ўзнаўляюцца пры дапамозе мадэлі «тапонім – звязаная з ім падзея»: *Але Чарнобыль хто прадбачыў?* (В. Карамазаў).

У якасці вобразных і ацэначна-экспрэсіўных сродкаў мастацкай выразнасці ў тэкстах мастацка-біяграфічнай прозы пашыраны параўнальныя канструкцыі з кампанентам тапонімам. Геаграфічныя назвы могуць выступаць як у ролі суб'екта, так і аб'екта параўнання: *…чуе лапатанне млынавых колаў на Чаратоўцы, якая нагадвае Палату…* (А. Лойка). У прааналізаваным фактычным матэрыяле дамінуюць ужыванні тапанімічных адзінак як аб'ектаў параўнання.

Асобае ідэйна-мастацкае значэнне ў кантэксце твораў набывае выкарыстанне ў складзе параўнальных канструкцый тапонімаў (айконімаў, гідронімаў, дрымонімаў і інш.), якія суадносяцца з рэальнай геаграфічнай прасторай Беларусі: *Дык жа бачыце вы, шаноўная публіка, ці не бачыце, як квітнее маё Поле Друкарскае: квітнее, расцвітае, як луг заліўны над Дзвіною;*

МГПУ им. И. П. Шамякина

*як паляна ў бары за возерам Чарсвята; як сцежка прыдарожная пры жыцце!* (А. Лойка).

Адабраныя з твораў беларускай мастацка-біяграфічнай прозы тапанімічныя перыфразы класіфікаваны з улікам канструктыўна-семантычнага ўдзелу онімаў і апелятываў у іх фарміраванні. Самымі распаўсюджанымі з'яўляюцца апісальныя выразы, у якіх апорным кампанентам выступаюць апелятывы *зямля*, *край*, *кут* (*арыйская зямля* – 'Заходняя Германія'; *заходні край* – 'Беларусь'), і перыфразы, якія маюць у сваім складзе агульны назоўнік і антрапонім, але ўказваюць на топааб'ект (*вёска Максіма Гарэцкага*, *горад Пушкіна*, *куток Якуба Коласа*). Звычайна ў такіх перыфрастычных спалучэннях апорным кампанентам выступаюць словы *вёска*, *зямля*, *край*, *куток*, *радзіма*, а залежным – прэцэдэнтныя імёны, якія называюць асоб добра вядомых для пэўнай лінгвакультурнай супольнасці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

Праведзены комплексны аналіз лексіка-семантычных і функцыянальна-стылістычных асаблівасцей анамастычнай прасторы беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя дазволіў зрабіць наступныя высновы:

1. У беларускім літаратурным працэсе другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя атрымаў плённае развіццё новы тып літаратуры, для якога ўласціва гарманічнае спалучэнне дакументальнага і мастацкага пачаткаў, увядзенне новага героя – рэальнай творчай асобы, чыё імя ў сучасным грамадстве мае прэцэдэнтны характар і ўспрымаецца як пэўны культурны сімвал (*Францыск Скарына*, *Янка Купала*, *Максім Багдановіч*, *Вітольд Бялыніцкі-Біруля*, *Гаўрыла Вашчанка* і інш.), а факты біяграфіі выступаюць асноўнымі сюжэтаўтваральнымі элементамі. Характэрныя для мастацка-біяграфічнай прозы вобразы-тыпы прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, для якіх жывапіс, літаратура, музыка – гэта натуральнае асяроддзе быцця, вызначылі шырокі вертыкальны кантэкст твораў, вербальную інтэрпрэтацыю і стварэнне «шматгалосся» розных сфер мастацтва ў межах гэтых літаратурных твораў і ўключэння іх у інтэртэкстуальны дыялог.

Сацыяльна-культурная значнасць імёнаў прататыпаў абумовіла ўжыванне іх у мастацкіх тэкстах без змен, акрамя выпадкаў, калі замена імёнаў пэўных персанажаў апраўдана ідэйна-стылістычнай задумай твора (напрыклад, у аповесці В. Карамазава «Брама»: Алесь → *Антось* – алюзія на вядомы вобраз-

МГПУ им. И. П. Шамякина

тып *дзядзькі Антося* з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля») альбо выклікана этычнымі ці ідэалагічнымі фактарамі, як гэта адбылося ў першым выданні рамана-эсэ А. Лойкі «Як агонь, як вада…»: Луцкевічы → *Лапкевічы*, Ластоўскі → *Ласоўскі.*

Прынцып дакументалізму, пакладзены ў аснову мастацка-біяграфічнай прозы, зварот аўтараў да прататыпаў, натуральна абумовілі выкарыстанне імі рэальнага анамастыкону, заснаванага на адпаведнасці антрапанімічнай сістэмы твораў традыцыйнаму іменніку пэўнага часу і апоры на суадносны з рэальнай геаграфічнай прасторай тапанімікон у арганізацыі мастацкага хранатопу [1, 3, 7, 8, 13].

2. Арганізацыя анамастычнай прасторы мастацка-біяграфічнай прозы мае свае асаблівасці. Яе антрапацэнтрызм у кантэксце ідэйна-тэматычнага зместу твораў дадзенага літаратурнага напрамку набывае асобае значэнне за кошт прэцэдэнтнасці і выразных сугестыўна-асацыятыўных магчымасцей імёнаў асноўных персанажаў. У каляядзерную прастору анамастыкону таксама ўваходзяць прэцэдэнтныя антрапонімы ў дэнататыўным іх ужыванні, якія, як правіла, называюць прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, грамадскіх і культурных дзеячаў адлюстраванага перыяду. У ліку іншых разрадаў паэтонімаў антрапонімы выступаюць самымі ўжывальнымі.

Не менш важнае значэнне ў стварэнні анамастычнага фону дзеяння маюць рэальныя тапонімы, якія звычайна выступаюць у функцыі маркёраў-лакалізатараў. Каляядзерную пазіцыю ў асноўным займаюць харонімы, айконімы і гідронімы, суадносныя з рэальнай прасторай Беларусі, што адпавядае ідэйна-мастацкай канцэпцыі твораў і прынцыпу біяграфізму, пакладзенага ў іх аснову (*Палессе*, *Прыпяць*, *Дняпро* ў аповесці В. Карамазава «Брама», *Полацк* у рамане А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» і інш.). Паводле колькаснага складу тапонімы займаюць другое месца пасля антрапонімаў.

Для анамастычнай прасторы твораў мастацка-біяграфічнага напрамку ўласціва высокая шчыльнасць паэтонімаў і іх багатая семантычная разнастайнасць, што, у першую чаргу, тлумачыцца жанравай прыналежнасцю тэкстаў (аповесці, раманы, эсэ) і, як вынік, наяўнасцю мноства сюжэтных ліній, вялікай колькасцю персанажаў і інш., а таксама ідэйна-тэматычнай скіраванасцю твораў. Вылучаецца аб'ёмнае семантычнае аб'яднанне артыёнімаў, якія з'яўляюцца арганічнай часткай анамастыкону белетрызаваных біяграфій беларускіх мастакоў (аповесці В. Карамазава «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «Брама», «Антон», «Зямля Фердынанда» і інш.), і іншых ідыёнімаў, дэнататы якіх належаць да разумовай, мастацкай сферы чалавечай дзейнасці,

МГПУ им. И.П. Шамякина

што таксама падкрэслівае прыналежнасць мастацка-біяграфічнай прозы да інтэлектуальнага дыскурсу.

Асобай адзінкай намінацыі, якая забяспечвае семантычнае і структурнае адзінства мастацкага тэксту і з'яўляецца цэнтральным кампанентам яго анамастычнай прасторы, выступае загаловак. Вызначана, што біблёнімам твораў названага літаратурнага напрамку ў высокай ступені ўласціва актуалізацыя катэгорый антрапацэнтрычнасці пераважна праз указанне ў загалоўку імя галоўнага персанажа (тыпу «*Загадка Багдановіча*», «*Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі*», «*Тройчы пра Стральцова*» і г. д.) і інтэртэкстуальнасці («*Унучка Францішка Скарыны, альбо Зэк № 0-287*», «*Як агонь, як вада…*», «*З вокам і сэрцам Дон Кіхота*» і інш.) шляхам спалучэння мастацкага твора з пазатэкставай інфармацыяй, уключэння яго ў міжкультурны кантэкст. Распаўсюджанай з'явай выступае наяўнасць падзагалоўкаў, якія канкрэтызуюць жанравую форму і характар аповеду твора або ўтрымліваюць мінімальныя звесткі пра яго змест і сюжэт («*Антон: аповесць-эсэ ў стылі рэтра*», «*З вясною ў адным вагоне: жывапісная палітра*» В. Карамазава, «*Стану песняй...: Жыццё і творчасць Цёткі: дакументальная аповесць*» Л. Арабей [1, 3, 5, 7].

3. Сярод найважнейшых рыс антрапанімічнай сістэмы прааналізаваных мастацкіх тэкстаў вылучаюцца наступныя: а) паралельнае суіснаванне дзвюх кананічных сістэм імёнаў: візантыйска-праваслаўнай і рымска-каталіцкай (*Алена* і *Гэлена*, *Іосіф* і *Юзік*); б) шырокае ўжыванне нацыянальна адметных, этнамаркіраваных варыянтаў антрапонімаў, а таксама афіцыйных / поўных і кваліатыўных формаў у залежнасці ад камунікатыўнага кантэксту і мастацка-стылістычных задач (напрыклад, *Афанасій* і *Апанас*; *Вітольд*, *Вітава*, *Віталій*, *Віталік* і *Віталь*; *Канстанцін, Косця* і *Кастусь / Костусь*); в) выкарыстанне адна-, двух- і трохкампанентных антрапаформул, сярод якіх пераважае аднакампанентная формула іменавання паводле мадэляў «асабовае імя» і «прозвішча». Асноўныя функцыі такіх антрапонімаў – ідэнтыфікацыя персанажаў і іх дадатковая (нацыянальная, сацыяльная, узроставая і інш.) характарыстыка.

Як эмацыянальна-экспрэсіўны і ацэначны сродак апісання вобразаў-персанажаў выкарыстоўваюцца неафіцыйныя празванні асоб – мянушкі. У прааналізаваных творах асобна разгледжаны індывідуальныя, генесіянімічныя, групавыя і адпрозвішчныя найменні. Вызначана, што найбольшую канатацыйную насычанасць, выразную нацыянальную і культурна-гістарычную спецыфіку маюць матываваныя індывідуальныя мянушкі (*Абыціха, Баечнік, Вол, Свіное Вока*, *Таўкач*, *Шляхта* і інш.) і генесіянімічныя празванні, якія

МГПУ им. И. П. Шамякина

адлюстроўваюць назыўную традыцыю народна-дыялектнага маўлення (*Луцэўчык, стары Луцэўчык, Луцэвічыха* / *Луцэўчыха*).

Семантычныя асаблівасці і канатацыйныя магчымасці абумовілі выкарыстанне прэцэдэнтных імёнаў у якасці кампанентаў анамастычных перыфраз (*аўтар «Палескай хронікі», мова Купалы, часы Вітаўта*), метафар (*нашчадкі Скарыны, другі Хадыка, сапраўдны Юдаш*), параўнанняў (*як сам-Бог, сам-Ярыла, як Прадслава – дачка князева, нібы Ісус Сірахаў*). Выбар і якасны склад такіх адзінак, ужытых з прамым і пераносным значэннем, з'яўляецца нацыянальна абумоўленым і акрэслівае кола фонавых ведаў, неабходных чытачу для поўнага дэкадавання мастацкага тэксту. Паводле генетычнай класіфікацыі пераважаюць прэцэдэнтныя антрапонімы са сфер-крыніц «Літаратура» і «Гісторыя» [3, 4, 8, 10, 13, 14, 16, 17].

4. Тапонімы займаюць ключавую пазіцыю ў фарміраванні мастацкага хранатопу, дакладнае разуменне якога залежыць ад інтэрпрэтацыі ідэйна-тэматычнага зместу твора. Так, выкарыстанне рэальных тапанімічных адзінак у творах мастацка-біяграфічнай прозы В. Карамазава, А. Лойкі, А. Мальдзіса і інш. аўтараў падкрэслівае іх фактаграфічнасць і дакументальную аснову. Ужыванне макратапонімаў, айконімаў, гідронімаў, назваў дробных топааб'ектаў спрыяе фарміраванню канкрэтнага ўспрыняцця і ўсведамлення рэцыпіентам геаграфічнай лакалізацыі сюжэтнага дзеяння, а рэпрэзентацыя іх як рэальных аб'ектаў садзейнічае стварэнню гістарычнага кантэксту твораў і іх нацыянальна-культурнай спецыфікі.

Рэальны тапанімікон твораў разгледжанага літаратурнага напрамку, акрамя рэалізацыі сюжэтаўтваральнай функцыі, непасрэдна задзейнічаны ў інтэрпрэтацыі тэмы *малой радзімы*. Так, дамінуючым у мастацка-біяграфічнай прозе В. Карамазава выступае анамастыкон *Магілёўшчыны* і *Палесся*, што абумоўлена фактамі біяграфій прататыпаў герояў гэтых твораў і самога пісьменніка. Мастацкае асэнсаванне рэгіянальных онімаў, канатацыйна насычаных і ўзбагачаных эмацыйнымі прырашчэннямі, што апасродкаваны ўласнымі аўтарскімі перажываннямі, адпавядае ідэйна-мастацкай задуме твораў і фарміруе агульны гісторыка-культурны фон дзеяння.

На ўзбагачэнне рэгіянальна-этнаграфічнага каларыту твораў, як сведчыць кантэкст, скіравана выкарыстанне комплексных спецыфічных мастацка-стылістычных сродкаў: ужыванне нацыянальна адметных тапанімічных мадэляў, сярод якіх асабліва вылучаюцца геаграфічныя назвы з фармантам *-шчына* тыпу *Васілеўшчына, Магілёўшчына*; засяроджванне ўвагі на семантыцы тапонімаў, іх этымалагізацыі з мэтаю аднаўлення лексіка-семантычных і канатацыйных значэнняў; выкарыстанне ўстарэлых

МГПУ им. И. П. Шамякина

геаграфічных адзінак намінацыі – гістарыёнімаў (*Кіеўская Русь*, *Жамойць; Ашмянскі павет, Магілёўская губерня*) і археонімаў (*Бярэсце*, *Вільня*, *Менск*), што з'яўляюцца выразнымі знакамі пэўных эпох і ўзнаўляюць культурныя і сацыяльна-палітычныя асаблівасці часу.

Значны канатацыйны патэнцыял тапонімаў, асабліва прэцэдэнтных (*Вільня*, *Грунвальд*, *Дняпро*, *Крэва*, *Палессе*, *Прыпяць*, *Чарнобыль*), што складаецца з экстралінгвістычных фактараў, аксіялагічных і культурных прырашчэнняў, абумоўлівае іх выкарыстанне ў якасці другасных намінацый, у складзе вобразна-стылістычных сродкаў – метанімій, метафар, параўнанняў, перыфраз і інш., за кошт чаго ствараецца адпаведны асацыятыўны фон і надаецца выразная экспрэсіўная ацэначнасць пэўнаму топааб'екту ці сітуацыі (*Крэва – сэрца Літвы*; *край па-над Прыпяццю*; *Вільня – не Прага*; *нібы Палаты глыбей, Дзвіны шырэй*). У выніку гэтага адбываецца страта асноўнай адрасна-ўказальнай функцыі тапанімічных адзінак і актуалізацыя дадатковых асацыяцый, што дазваляе ўспрымаць іх як пэўныя культурныя коды, сімвалы (напрыклад, *Крэва-замак*, *Крэва-час*, *Крэва-дзяржава; з Крэва нарадзіўся Грунвальд*), што ў сваю чаргу ўзмацняе вобразнасць і эмацыйнасць, сэнсавае багацце мастацкага тэксту [1, 2, 6, 7, 11, 12, 15].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны:

1) у навукова-даследчай дзейнасці пры далейшым вывучэнні пытанняў літаратурнай анамастыкі, асаблівасцей функцыянавання паэтонімаў у мастацкім тэксце;

2) у вучэбна-метадычнай працы ВНУ пры выкладанні курсаў літаратурнай анамастыкі, літаратуразнаўства, стылістыкі, лінгвістычнага аналізу мастацкага тэксту, этналінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, лінгвакраязнаўства (акты аб укараненні вынікаў НДР у навучальна-выхаваўчым працэсе кафедры беларускай і рускай філалогіі і кафедры спецыяльнай педагогікі і методык дашкольнай і пачатковай адукацыі МДПУ імя І. П. Шамякіна ад 12.06.2020 г.);

3) у навучальным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі пры выкладанні роднай мовы і літаратуры, гісторыі, геаграфіі, у краязнаўчай працы (акт аб укараненні вынікаў НДР у адукацыйны працэс ДУА «Цярэніцкі дзіцячы сад – пачатковая школа» ад 16.12.2019 г.);

4) у лексікаграфічнай практыцы па складанні слоўнікаў анамастыкону мастацкіх твораў асобных аўтараў, слоўнікаў перыфраз (Дадаткі А і Б).

МГПУ им. И. П. Шамякина

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Манаграфіі

1. Слівец, В. Р. Малая і вялікая радзіма ў анамастыконе пісьменнікаў / В. В. Шур, В. Р. Слівец ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Мазыр. дзярж. пед. ун-т імя І. П. Шамякіна». – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2019. – 170 с.

### Артыкулы ў рэцэнзуемых выданнях

2. Слівец, В. Р. Анамастыкон Кіева ў кантэксце аповесці Віктара Карамазава «Брама» / В. Р. Слівец // Мова і культура. – 2018. – Вип. 21, т. ІІ (191). – С. 165–171.

3. Слівец, В. Р. Семантыка-стылістычныя асаблівасці антрапанімікону аповесці Віктара Карамазава «Брама» / В. Р. Слівец // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2019. – № 1 (53). – С. 154–158.

4. Слівец, В. Р. Мянушкі ў соцыуме і ў творах мастацкай літаратуры: семантыка-стылістычныя і функцыянальныя асаблівасці / В. Р. Слівец // Род. слова. – 2019. – № 9. – С. 38–40.

5. Слівец, В. Р. Загаловак як галоўны кампанент анамастычнай прасторы мастацкага тэксту / В. Р. Слівец // Род. слова. – 2020. – № 6. – С. 35–38.

### Публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў

6. Слівец, В. Р. Паэтонімы-гідронімы як кампаненты мастацкай прасторы твораў Уладзіміра Караткевіча / В. Р. Слівец // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі (да 80-годдзя з дня нараджэння праф. Г. М. Малажай) : зб. навук. арт. : у 2 ч. / УА «Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна» ; рэдкал.: Л. І. Яўдошына (адк. рэд.) [і інш.]. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2018. – Ч. 2. – С. 90–93.

7. Слівец, В. Р. Палессе ў творчым лёсе Гаўрылы Вашчанкі (паводле аповесці Віктара Карамазава «Брама») / В. Р. Слівец // Духоўная спадчына Усходняга Палесся : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны», Навук.-даслед. ін-т гісторыі і культуры ўсходнеславян. народаў ; рэдкал.: А. М. Воінава (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – С. 254–258.

8. Слівец, В. Р. Прэцэдэнтныя імёны ў аповесці Віктара Карамазава «Брама» / В. Р. Слівец // «Дарагое мне – і маё – беларускае» : навук. зб. да 100-годдзя з дня нараджэння праф. Ф. М. Янкоўскага / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя

МГПУ им. И. П. Шамякина

Максіма Танка, каф. мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ; рэдкал.: Г. М. Валочка [і інш.] ; навук. рэд. Д. В. Дзятко. – Rīga : BVKI, 2018. – С. 165–169.

9. Слівец, В. Р. Уласныя імёны ў дашкольнай адукацыі / В. Р. Слівец // Дзіцячы сад – пачатковая школа: вопыт, пераемнасць, перспектывы : зб. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Мазыр. дзярж. пед. ун-т імя І. П. Шамякіна» ; рэдкал.: Б. А. Крук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2018. – С. 99–101.

10. Слівец, В. Р. Мянушкі ў соцыуме і ў мастацкім тэксце / В. Р. Слівец // Текст. Язык. Человек : сб. науч. тр. / М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. обществ. об-ние преподавателей рус. яз. и лит., Белорус. респ. фонд фундам. исслед., Представительство Россотрудничества в Респ. Беларусь – Рос. центр науки и культуры в Гомеле, Мозыр. гос. пед. ун-т им. И. П. Шамякина, Белгород. гос. нац. исслед. ун-т, Моск. пед. гос. ун-т (Покров. фил.), Пензен. гос. ун-т ; редкол.: С. Б. Кураш (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь : МГПУ им. И. П. Шамякина, 2019. – С. 103–106.

11. Слівец, В. Р. Геаграфічныя намінацыі з фармантам *-шчын-*а як рэгіянальна і нацыянальна адметная мадэль беларускай тапаніміі / В. Р. Слівец // Славянские языки и культуры в современном мире : сб. науч. ст. / УО «Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины», Представительство Россотрудничества в Респ. Беларусь, Рос. центр науки и культуры в Гомеле ; редкол.: И. Г. Гомонова (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2019. – С. 122–128.

12. Сливец, О. Г. Приёмы художественной этимологизации топонимов (на примере белорусской художественно-биографической прозы) / О. Г. Сливец // Язык и культура региона как составляющие образовательного пространства : сб. ст. по итогам III Междунар. науч.-практ. конф., Белгород, 14–15 мая 2020 г. / М-во оразования и науки Рос. Федерации, ФГАОУ ВО «Белгород. гос. нац. исслед. ун-т» ; отв. ред. Т. Ф. Новикова. – Белгород : ООО «Эпицентр», 2020. – С. 208–212.

**Матэрыялы канферэнцый**

13. Слівец, В. Р. Нацыянальна-прэцэдэнтныя імёны ў аповесці Віктара Карамазава «Брама» / В. Р. Слівец // Языковая личность и эффективная коммуникация в современном поликультурном мире : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 25−26 окт. 2018 г. / Белорус. гос. ун-т, фак. социокультур. коммуникаций, каф. теории и практики перевода ; редкол.: О. И. Уланович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 222–226.

МГПУ им. И. П. Шамякина

14. Слівец, В. Р. Мянушкі ў мове рамана Віктара Карамазава «Мастак і парабкі» / В. Р. Слівец // Лингвистика, лингводидактика, лингвокультурология: актуальные вопросы и перспективы развития : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 14–15 марта 2019 г. / Белорус. гос. ун-т, фак. социокультур. коммуникаций ; редкол.: О. Г. Прохоренко (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2019. – С. 500–505.

15. Слівец, В. Р. Тапанімічная перыфраза ў мове мастацкай літаратуры / В. Р. Слівец // Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік – Асоба – Час» : матэрыялы VI Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 27 верас. 2019 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Мазыр. дзярж. пед. ун-т імя І. П. Шамякіна» ; рэдкал.: А. У. Сузько (адк. рэд.), Т. М. Чэчка, Л. М. Мазуркевіч. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2019. – С. 139–142.

16. Слівец, В. Р. Андронімы як нацыянальна выразныя спосабы намінацыі персанажаў у мове мастацкай літаратуры / В. Р. Слівец // Языковая личность и эффективная коммуникация в современном поликультурном мире : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию основания каф. теории и практики перевода фак. социокультур. коммуникаций Белорус. гос. ун-та, Минск, 24–25 окт. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т, фак. социокультур. коммуникаций, каф. теории и практики перевода ; редкол.: С. В. Воробьёва (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2019. – С. 214–218.

17. Слівец, В. Р. Анамастычныя перыфразы з прэцэдэнтнымі антрапонімамі / В. Р. Слівец // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 20 лістап. 2019 г. / УА «Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна» ; рэдкал.: Л. В. Леванцэвіч, Т. А. Кісель, Н. Р. Якубук ; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2020. – С. 145–149.

МГПУ им. И. П. Шамякина

## РЭЗЮМЭ

Слівец Вольга Рыгораўна

**Анамастычная прастора беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя**

**Ключавыя словы:** анамастычная прастора, апелятывацыя, канатацыя, мастацка-біяграфічная проза, метафара, нацыянальна-культурны кампанент, параўнанне, паэтонім, перыфраза.

**Мэта даследавання:** вылучэнне лексіка-семантычных і функцыянальна-стылістычных асаблівасцей анамастычнай лексікі беларускай мастацка-біяграфічнай прозы другой паловы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя, выяўленне яе нацыянальнай і гісторыка-культурнай спецыфікі.

**Метады даследавання:** апісальна-інтэрпрэтацыйны, параўнальна-супастаўляльны, стылістычны метады вывучэння анамастычных адзінак, сабраных шляхам суцэльнай і мэтавай выбарак з мастацкіх тэкстаў, іх кантэкстуальны аналіз, прыёмы колькаснага падліку, лінгвакультуралагічнае і лінгвакраязнаўчае каменціраванне.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню даследавана анамастычная прастора мастацка-біяграфічнай прозы, што дало магчымасць правесці комплексны аналіз семантыка-стылістычных, функцыянальных асаблівасцей анамастычных адзінак як фактаў гісторыі і культуры, іх жанраўтваральных і вобразна-выяўленчых магчымасцей.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Навуковыя вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым вывучэнні пытанняў літаратурнай анамастыкі; у вучэбна-метадычнай працы пры выкладанні курсаў анамастыкі, стылістыкі, лінгвістычнага аналізу мастацкага тэксту, этналінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, лінгвакраязнаўства; у навучальным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі пры выкладанні роднай мовы і літаратуры, гісторыі, геаграфіі, у краязнаўчай працы; у лексікаграфічнай практыцы па складанні слоўнікаў анамастыкону мастацкіх твораў асобных аўтараў, слоўнікаў перыфраз.

**Галіна выкарыстання:** мовазнаўства, анамастыка, стылістыка, лінгвістычны аналіз тэксту, лексікалогія.

МГПУ им. И.П. Шамякина

# РЕЗЮМЕ

Сливец Ольга Григорьевна

**Ономастическое пространство белорусской художественно-биографической прозы второй половины XX – начала XXI века**

**Ключевые слова:** ономастическое пространство, апеллятивация, коннотация, художественно-биографическая проза, метафора, национально-культурный компонент, сравнение, поэтоним, перифраза.

**Цель исследования:** выделение лексико-семантических и функционально-стилистических особенностей ономастической лексики белорусской художественно-биографической прозы второй половины XX – начала XXI века, выявление её национальной и историко-культурной специфики.

**Методы исследования:** описательно-интерпретационный, сравнительно-сопоставительный, стилистический методы изучения ономастических единиц, собранных методом сплошной и целевой выборок из художественных текстов, их контекстуальный анализ, приёмы количественного подсчёта, лингвокультурологическое и лингвистическое комментирование.

**Полученные результаты и их новизна:** впервые исследовано ономастическое пространство художественно-биографической прозы, что позволило провести комплексный анализ семантико-стилистических, функциональных особенностей онимов как фактов истории и культуры, их жанрообразующих и художественно-выразительных возможностей.

**Рекомендации по использованию результатов.** Научные результаты диссертации могут быть использованы при дальнейшем изучении литературной ономастики; в учебно-методической работе в рамках преподавания курсов ономастики, стилистики, лингвистического анализа художественных текстов, этнолингвистики, лингвакультурологии, лингвокраеведения; в учебном процессе общеобразовательных заведений при обучении родному языку и литературе, истории, географии, в краеведческой работе; в лексикографической практике для составления словарей ономастикона художественных произведений отдельных авторов, словарей перифраз.

**Область применения:** языкознание, ономастика, стилистика, лингвистический анализ текста, лексикология.

МГПУ им. И. П. Шамякина

**SUMMARY**

Olga G. Slivets

**Onomastic space of the Belarusian artistic and biographical prose of the second half of the XXth – the beginning of the XXIst century**

**Key words:** onomastic space, appellativation, connotation, artistic and biographical prose, metaphor, national-cultural component, comparison, poetonym, periphrasis.

**The objective of the research** is identification of lexical-semantic and functional-stylistic peculiarities of the onomastic vocabulary of the Belarusian artistic and biographical prose of the second half of the XXth – beginning of the XXIst century, determination of its national and historical-cultural specifics.

**The methods of the research:** descriptive-interpretive analysis, comparative-contrastive analysis, stylistic methods of study of onomastic units collected from literary texts using continuous and purposive sampling methods, their contextual analysis, quantitative calculation, linguistic and cultural commentary.

**The results obtained and their novelty:** for the first time the onomastic space of artistic and biographical prose is studied, which allowed to conduct a comprehensive analysis of semantic-stylistic and functional features of onomastic units as facts of history and culture, their genre-forming and artistic-expressive potential.

**Recommendations on the use of the results obtained.** The scientific results of the thesis can be applied in the process of further study of literary onomastics; in teaching and guiding work as part of teaching courses in onomastics, stylistics, linguistic analysis of literary texts, ethnolinguistics, linguoculturology, linguo-area studies; in the educational process in secondary schools while teaching native language and literature, history, geography, in local history work; in the lexicographical practices for compiling dictionaries of the onomasticon of art works of the individual authors, periphrasis dictionaries.

**The sphere of application**: linguistics, onomastics, stylistics, linguistic text analysis, lexicology.


МГПУ им. И. П. Шамякина